# АЎТАРСКАЯ ЖУРНАЛІСТЫКА ЯК РЭГУЛЯТАР ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ПАВОДЗІН ГРАМАДСТВА

***М. С. Цюцянькоў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tsiutsiankovMS@bsu.by*

*Навуковы кіраўнік – В. І. Іўчанкаў,*
*доктар філалагічных навук, прафесар*

Новая эпоха ў эвалюцыі масавай камунікацыі на мяжы XX–XXI стагоддзяў кардынальна трансфармавала мадэлі камунікатыўнага ўзаемадзеяння з аўдыторыяй. Перыяд станаўлення сучаснай навінавай журналістыкі прайшоў мноства этапаў яе фарміравання. У артыкуле разглядаецца месца і роля аўтарскай журналістыкі, яе анталагічны статус. Заўважаецца, што аўтарская журналістыка сення знаходзіцца на сваім уздыме, што звязана з інфармацыйнымі запытамі грамадства.

***Ключавыя словы:*** інфармацыя; факт; навіна; інфармацыйная нагода.

# AUTHOR JOURNALISM AS A REGULATOR OF SOCIETY'S INFORMATIONAL BEHAVIOR

***M. S. Tutenkov***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. S. Tutenkov (tsiutsiankovMS@bsu.by)*

*Research advisor – V. I. Ivchenkov, doctor of Philology, professor*

A new era in the evolution of mass communication at the turn of the XX–XXI centuries radically transformed the models of communicative interaction with the audience. The period of formation of modern news journalism went through many stages of formation. The article examines the place and role of media texts of author journalism, its ontological status. It is noted that author journalism is on the rise today, it is connected with society's need for information.

***Key words:*** information, fact, news, information occasion.

Сучасныя ўмовы функцыянавання інфармацыйнай прасторы ў час нарастаючай канкурэнцыі за гледача прымушае медыягігантаў шукаць новыя сродкі і механізмы для захавання лідзіруючых пазіцый у рэйтынгах медыявымяральнікаў, у іерархіі спажывецкіх пераваг. Натуральна, гэта звязана з актыўным тэхналагічным і функцыянальным абнаўленнем сродкаў перадачы інфармацыі.

Медыякантэнт аўтарскай журналістыкі апошнія тры гады больш накіраваны на палітычную тэматыку, другаснымі з'яўляюцца эканоміка, спорт, культура. Гэтую думку пацвярджае колькасны паказчык нацыянальнай сеткі тэле- радыевяшчання і друкаваных СМІ. Так, у перыяд з 1 лістапада 2023 года да 1 лютага 2024 года выйшла каля 300 выпускаў мэтавых рубрык аўтарскай журналістыкі на рэспубліканскіх каналах, аналітычных праграм, якія характарызаваліся, перш за ўсе, выкрывальнай ці вытлумачальнай журналістыкай.

Заўважаецца і пэўная тэндэнцыя да высокачастотнага атрымання медыякантэнту праз аўтарскую журналістыку. Калі раней спажыўцы кантэнту, каб задаволіць інфармацыйныя запыты, маглі адкрыць пэўныя камунікацыйныя каналы (друкаваныя СМІ, радые- і тэлевяшчанне, вэб-сайты), то сення, дастаткова паглядзець выпуск навін ці перадачу журналіста-блогера на тэлебачанні, прагледзець стужку ці пачытаць аўтарскую калонку.

Аўтарская журналістыка ў апошнія гады знаходзіцца на ўздыме. Неадначасова Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам заўважалася, што «сапраўдным адкрыццем стала айчынная аўтарская журналістыка – хвосткая і дынамічная, яна пераканаўча адказвае на інфармацыйныя выклікі нашага часу» [2]. Анталагічны статус аўтарскай журналістыкі вылучыў беларускі прафесар В. Іўчанкаў. У манаграфіі «Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту» ен апісвае структуру вобраза аўтара (аўтарскага «я»), што «супадае з узаемазвязанымі ўзроўнямі структуры тэксту: *камунікатыўна-эстэтычны* (ідэйна-эстэтычны, ідэалагічны), *жанрава-кампазіцыйны* і *ўласна маўленчы*» [1, с. 90]. Менавіта на першым ўзроўні ў медыятэкстах фарміруецца змест аўтарскай задумы як вынік эстэтычнага бачання навакольнага свету; на другім – забяспечваецца адзіны пункт гледжання на ўспрыманне тэксту; на трэцім – выражаецца камунікатыўная зададзенасць твора.

Сучасная медыяпрастора знаходзіцца ў даволі складаных інфармацыйных абставінах развіцця канвергентных працэсаў, калі надзвычай важным становіцца пытанне аб якаснай індывідуальнай журналістыцы, здольнай ствараць запатрабаваны інфармацыйны кантэнт на пляцоўках СМІ. Прадстаўнікамі такой журналістыкі на айчыннай медыяпрасторы часцей за ўсе становяцца эксперты, журналісцкая праца якіх адрозніваецца пры падборы кантэнту, яго апрацоўцы і падачы ад інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці звычайных рэпарцераў. Аднак у сучасным дыскурсе такія журналісты аўтарскага кантэнту не разглядаюцца як выключны суб’ект прафесійнай дзейнасці ў медыяпрасторы.

Безумоўна, калумністы прымалі актыўны ўдзел у фарміраванні айчыннай медыярэальнасці на працягу ўсей гісторыі развіцця беларускай журналістыкі. Аналіз іх дзейнасці дазваляе выявіць пэўныя адметныя рысы працы стваральнікаў «якаснай журналістыкі», «экспертнай журналістыкі»: 1) дыскурсіўная накіраванасць калумнісцкай журналістыкі; 2) суб’ектыўнасць пры выбары інфармацыйных нагод; 3) пэўныя жанравыя фарматы падачы кантэнту (публіцыстычны артукул, аўтарская перадача, інтэрв’ю); 4) характар адлюстроўвання журналісцкага кантэнту ў светаадчуванні чытача; 4) высокая ступень суб’ектыўнай мадальнасці аўтарскіх тэкстаў, іх глыбіня і погляд журналіста на ўзнятыя праблемы; 5) уменне ствараць асаблівы аўтарскі кантэнт. Безумоўна, гэты ланцуг можа працягвацца і далей пры вызначэнні адметных рысаў, але намі былі вызначаны найбольш важныя.

Стваральнікі медыятэкстаў аўтарскай журналістыкі дазваляюць зрабіць папярэднія вынікі, што іх кантэнт з’яўляецца прыкладам палітычнай журналістыкі і якаснага кантэнту, неабходнага для фарміравання ў аўдыторыі аб’ектыўнага погляду на сучасныя аўтару рэаліі. Такі журналіст, безумоўна, робіць вялікі ўнесак у фарміраванне медыяпрасторы, уплываючы на палітычную сістэму у цэлым.

Медыятэксты аўтарскай журналістыкі глыбока аналітычныя, іх кампазіцыя і змест фарміруюцца на аснове аўтарскіх назіранняў і «доказнасцю» прыведзеных аўтарам меркаванняў у адстойванні ўласнага гледжання. Можна лічыць, што інфармацыя калумністаў у друкаваных СМІ, у перадачах на радые і тэлебачанні масавы чытач падчас ўзнікнення грамадска важных выклікаў хутчэй будзе пачута аўдыторыяй, кантэнт аўтарскай журналістыкі сення становіцца

элітарнай з'явай на айчынным тэлебачанні. На кожным канале існуе пэўны «лідар думак», «інфлюэнсер», які задае парадак дня спажыўцам кантэнту, адсюль вынікае пэўны пастулат, што тэкст – гэта не проста лінгвістычная адзінка, а вынік чалавечай дзейнасці, творчага інтэлекту, камунікацыі і пазнання.

Заснавальнік беларускай тэоры журналістыкі прафесар Б. Стральцоў у сваіх працах так акрэслівае стан журналістыкі і яе месца ў акадэмічным дыскурсе: «у апошнія гады адбыліся значныя змены ў функцыянаванні журналістыкі, у тым ліку і па тэкставых фарматах. Мы пачалі пазбаўляцца ад зашоранасці ў вызначэнні абсягаў і мадэляў журналісцкай творчасці» [3, с. 192]. Менавіта для журналістаў-аўтараў уласціва ў большай ступені імкненне да раўнапраўнага дыялогу з чытачом, якога яны заклікаюць да самастойнага і крытычнага аналізу рэчыіснасці, што не датычыцца звычайных рэпарцераў. Калумністы ў сваіх праектах арганічна сумяшчаюць адкументальначць і актыўнае непасрэднае адлюстраванне рэчаіснасці з аднаго боку, і паглыбленне не толькі ў саму праблему, але і ў псіхалогію паводзін, з другога.

Зайважаецца пэўнае адрозненне аўтарскай журналістыкі ад звычайнай рэпарцерскай дзейнасці. Медыятэксты блогераў маюць у сваей большасці адрасата, наяўнічаюць формы звароту да гледача. Напрыклад, «і я вам дакажу», «будзем разбірацца разам», «а вы, глядачы, вырашайце самі...». Аўтарскія праграмы характарызуюцца яскравай аўтарскай мадальнасцю, нестандартным падыходам да асвятлення падзей; вядзеннем ў аўтарскіх праектах дыялогу з гасцямі на роўных, што не зусім вытрымлівалася ў ранейшых класічных формах журналістыкі. Справядліва заўважае прафесар В. Іўчанкаў, «журналісцкі тэкст выступае ў якасці своеасаблівага барометра на змены ў жыццевым уладкаванні грамадства, вызнача іх характар, прадвеснічае эвалюцыйным зрухам у сінтагматыцы моўных знакаў, аператыўна рэалізуе парадыгматычныя магчымасці мовы» [1, с. 5]. Медыятэкст калумніста, журналіста-аўтара дэкадзіруе рэчаіснасць, ствараючы пры гэтым мадэль «сацыяльны вопыт = тэкставая дзейнасць», якая ў аўтарскай журналістыкі праяўляецца найбольш поўна і яскрава. Для журналіста такой сферы неабходна выпрацаваць нормы і формы сацыяльных паводзін і набыць уласны, індывідуальны і непаўторны стыль перадачы думак; набыць культурны, агульна-палітычны і гістарычны вопыт і ўласны погляд на падзеі, што дазволіць паспяхова ўзаемадзейнічаць з масавай аўдыторыяй.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Іўчанкаў В. І.* Дыскурс беларускіх СМІ : арганізацыя публіцыстычнага тэксту. Мінск : БДУ, 2003. 257 с.
2. Приветствие участникам XIV Национального телевизионного конкурса "Телевершина" [Электронный ресурс]. URL: https://president.gov.by/ru/events/privetstvie-uchastnikam-hiv-nacionalnogo-televizionnogo-konkursa-televershina? (дата обращения: 27.01.2024).
3. *Стральцоў Б. В.* Метад – жанр – твор // Журналістыка-2000: Матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., 21 лістап. 2000 // Рэд. Калегія: В. П. Вараб’еў (адк. рэд.) і інш. Мн.: УП «Тэхнапрынт». 2000. С. 192–195.